# 2. Высновы й сцэнары

Палітыка Расеі ў дачыненьні да Беларусі зьяўляецца ключавой справай для будучыні рэжыму Лукашэнкі. Беларусь залежная ад Расеі на многіх плоскасьцях, перадусім у эканамічнай сфэры. Гэтак званы «беларускі эканамічны цуд», сутнасьць якога ў сталым эканамічным росьце не зважаючы на адсутнасьць рэформ, можа скончыцца разам з павышэньнем Расеяй цэн на энаргетычную сыравіну. Задаванае шмат гадоў пытаньне адносна стабільнасьці рэжыму Лукашэнкі можа знайсьці адказ у выпадку прынцыповай зьмены палітыкі Расеі ў дачыненьні да Беларусі.

У апошнія гады можна было неаднаразова мець уражаньне, што адбываецца пералом у зносінах паміж Менскам і Масквой, аднак пазьней аказвалася, што агрэсіўная рыторыка Крамля не перакладалася на практычныя дзеяньні, якія б зьмянялі расейскую палітыку адносна Беларусі. Найважнейшае пытаньне датычыць цяпер таго, ці можа Аляксандар Лукашэнка пры акрэсьленых уступствах перад Расеяй надалей разьлічваць на яе падтрымку, ці ўсё ж Масква пойдзе на радыкальны перагляд сваіх зносінаў зь Беларусьсю, паставіць на іншага палітыка і паспрабуе фарсаваць рэальную інтэграцыю ў форме супольнай дзяржавы.

Можна адрозьніць чатыры магчымыя сцэнары разьвіцьця сытуацыі ў расейска-беларускіх зносінах да часу прэзыдэнцкіх выбараў 2008 году ў Расеі.

## Сцэнар I

Найбольш верагодным сцэнаром здаецца працяг дагэтулешняй сытуацыі ў расейска-беларускіх зносінах. Гэта азначае, што расейскія ўлады паспрабуюць павялічыць узровень свайго кантролю над рэжымам Лукашэнкі, перадусім пяроймуць сетку газаправодаў, і пастараюцца ў большай, чым да гэтай пары, ступені кантраляваць беларускі гандаль нафтапрадуктаў. Як гэта ўжо зазначалася раней, падобныя дзеяньні безвынікова вяліся Крамлём шмат гадоў, і можна меркаваць, што зноў не дадуць плёну. Супраціў Лукашэнкі застанецца вялікі, бо ён разумее, што Расея не зацікаўленая дэстабілізаваньнем сытуацыі ў Беларусі. Расея баіцца таксама, што новы лідэр Беларусі мог бы быць яшчэ менш залежны ад Масквы, чым Лукашэнка. Ён перадусім меў бы адкрытую магчымасьць супрацоўніцтва з Эўрапейскім Зьвязам і ЗША, што ніколі ня ўдасца Лукашэнку. З гэтага пункту гледжаньня цяперашні прэзыдэнт Беларусі выгадны Крамлю. Трэба таксама заўважыць, што сёньняшні стан расейска-беларускіх зносінаў на руку частцы расейскіх элітаў, якая мае свае ўдзелы ў прыбытках з экспарту нафтапрадуктаў зь Беларусі ў Эўразьвяз, што прыносіць большыя прыбыткі, чым непасрэдны экспат нафты з расеі ў Эўразьвяз. Таму верагодна ў Расеі існуе лобі, якое стараецца захаваць *status quo* ў дачыненьнях на лініі Масква–Менск.

На падставе вышэйзгаданага можна зрабіць выснову, што магчымы газавы канфлікт прывядзе да ўмеркаванага павышэньня цаны расейскага газу (максымум да каля 95 даляраў, а значыць цаны, якую сёньня плаціць Украіна), што ня выкліча крызысу беларускай экноміікі. Лукашэнка зробіць усё, каб ня страціць кантролю над стратэгічна важным Белтрансгазам, хаця нельга выключыць, што яна згодзіцца на продаж меншаснага пакету акцыяў гэтага прадпрыемства. Ня будзе падпісаны Канстытуцыйны Акт Саюзнай дзяржавы, а гэта будзе азначаць, што беларуска-расейская інтэграцыя застанецца ілюзорнай. Дадатковым козырам у руках Лукашэнкі зьяўляецца магчымасьць павышэньня цаны за транзіт расейскіх энэргетычных рэсурсаў празь беларускую тэрыторыю на Захад. Сёньняшнія стаўкі, якія плацяць Беларусі расейскія прадпрыемствы, найніжэйшыя ў Эўропе.

Астатнія тры сцэнары здаюцца нашмат менш імавернымі, аднак нельга іх выключыць.

## Сцэнар II

Згодна з другой верагоднай мадэльлю, расейскія ўлады вырашаць зьмяніць рэжым у Беларусі. Расея пасьлядоўна давядзе да значнага павышэньня цаны газу для Беларусі (да ўзроўню 150-200 даляраў). Лукашэнка ня прыйме маскоўскіх умоваў і не дапусьціць да страты кантролю над Белтрансгазам, а таксама ня пойдзе на падпісаньне Канстытуцыйнага Акту Саюзнай дзяржавы, бо гэта азначала б канец сувэрэнітэту Беларусі й ягонай улады. Гэта прывядзе да найбольш сур'ёзнага ад 1991 году крызысу ў расейска-беларускіх зносінах. У выніку такога разьвіцьця падзеяў Расея паспрабуе выкарыстаць сытуацыю і правесьці апэрацыю па замене ўлады ў Менску, і закончыць працэс фармаваньня супольнай дзяржавы.

Аднак супраць гэтага сцэнара ёсьць як мінімум 4 аргумэнты.

1) Маскве непатрэбны канфлікт з найвярнейшым, прынамсі ў прапагандным аспэкце, саюзьнікам на постсавецкім абшары. У самой Расеі ды іншых краінах СНД гэта было б успрынята як параза расейскай палітыкі.

2) Значнае павышэньне цэнаў энэргіі магло б выклікаць эканамічны крызыс і выклікаць масавыя грамадзкія хваляваньні. З аднаго боку, гэта пахіснула б фундамэнт улады Лукашэнкі, а з другога пярэчыла б палітыцы Расеі, якая на абшары СНД панічна баіцца любых некантрляваных праяваў грамадзкай актыўнасьці, асабліва ў «рэвалюцыйнай» форме.

3) Расея ня мае сёньня ў Беларусі моцнага заплечча, на якім можна было б абаперціся пры магчымай апэрацыі зьмены ўлады.

4) Цягам бліжэйшага году Крэмль будзе заняты падрыхтоўкай да парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў, а значыць ён ня зможа адначасова засяродзіць увагу на справе Беларусі. Парадаксальна, ня выключана й тое, што магчымы сур'ёзны крызыс беларуска-расейскіх дачыненьняў можа прывесьці да кансалідаваньня беларускага грамадзтва вакол Лукашэнкі, і тым самым падоўжыць функцыянаваньне рэжыму.

## Сцэнар III

Паводле трэцяга сцэнара, расейскія ўлады пераадолеюць супраціў Лукашэнкі, і ў сувязі з гэтым запэўняць сабе кантроль над Беларусьсю праз пераняцьцё Белтрансгазу а таксама мазырскага й новаполацкага нафтакамбінатаў. Аднак яны пакінуць аслабленага Лукашэнку, які будзе вымушаны выконваць распараджэньні Крамля. У такім выпадку адбывалася б паступовае ўключэньне Беларусі ў склад Расеі на маскоўскіх умовах, хаця з пункту гледжаньня міжнароднага права надалей існавалі б дзьве дзяржавы.

## Сцэнар IV

Магчымы яшчэ адзін варыянт, сутнасьць якога ў тым, што расейскія ўлады стараліся б выкарыстаць беларуска-расейскую інтэграцыю дзеля вырашэньня праблемы 2008 году. Нельга выключыць, што дзякуючы аб'яднаньню Беларусі з Расеяй магла б паявіцца функцыя прэзыдэнта новай фэдэрацыі, якую ўзначаліў бы Ўладзімір Пуцін. Такое выйсьце, аднак, здаецца малаверагодным.